# Тэставыя заданні па беларускай мове ў 5-6 класах: кантроль ведаў

Практыкум для настаўнікаў

**Н. В. Ханкевіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі СШ №18 г.Пінска

**Мэта практыкуму**: павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў у пытаннях выкарыстання тэставых заданняў на ўроках беларускай мовы.

**Задачы:**

1. Разгледзець асаблівасці прымянення тэставых заданняў на ўроках беларускай мовы ў 5-6 класах.
2. Апрабіраваць тэставыя заданні на розных этапах урока беларускай мовы.
3. Прааналізаваць эфектыўнасць выкарыстання тэставых заданняў на ўроках беларускай мовы.

**Ход практыкуму**

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Вядучы віншуе прысутных і прапануе звярнуць увагу на карткі з намаляванымі сімваламі – знакамі прыпынку.

**Вядучы.** Выберыце той знак, які вам найбольш сімпатычны, ці вы лічыце, што ён падыходзіць вам.

? (пытальнік)
. (кропка)
! (клічнік)
, (коска)
… (шматкроп'е)
- ( працяжнік)

А цяпер паслухайце, якое азначэнне даюць псіхолагі людзям вашага знака:

**?** Праяўляюць жывую цікавасць да ўсяго, што адбываецца навокал.

**.** Ставяць ясныя мэты і заўсёды іх дасягаюць.

**!** Упэўненыя ў сабе людзі. Здольныя хутка прымаць рашэнні.

**,** Добрасумленныя, адказныя, настойлівыя, лёгка засвойваюць усё новае.

**…** Працалюбівыя, вынослівыя, заўсёды даводзяць пачатую справу да канца.

\- Актыўныя, крэатыўныя. Праяўляюць ініцыятыву, прымяняюць інавацыйныя дасягненні педагогікі.

Вядучы просіць кожнага настаўніка вызначыцца, чаго ён чакае ад практыкуму, і запісаць свой адказ у "Картку чаканняў".

| **Я хацела б** | +/- |
|---|---|
| Даведацца пра асаблівасці прымянення тэставых заданняў | |
| Апрабіраваць тэставыя заданні на розных этапах урока | |
| Прааналізаваць эфектыўнасць выкарыстання тэставых заданняў на ўроках мовы | |

**II. Пазнавальны этап**

Правільнае выкарыстанне тэставых заданняў як формы кантролю вучэбнай дзейнасці дазваляе настаўніку хутка ацэньваць атрыманыя вучнямі веды, уменні, навыкі, своечасова аказваць неабходную дапамогу і дасягаць пастаўленых мэт навучання, садзейнічае стварэнню спрыяльных ўмоў для фарміравання ў вучняў матывацыі, імкнення да вывучэння беларускай мовы. Тэсціраванне павышае якасць адукацыі, паказвае на ўзровень ведаў і ўменняў, інтэлектуальнага развіцця вучняў у адпаведнасці з мэтай адукацыі.

Выкарыстанне тэставых формаў кантролю для праверкі і ацэнкі ведаў вучняў павінна ажыцяўляцца пастаянна. Толькі тады наладжваецца дысцыпліна на ўроку, мяняецца стаўленне вучняў да дамашніх і класных заданняў, фарміруецца цікавасць да прадмета, а таксама адбываецца выхаванне такіх якасцей асобы, як працавітасць, самастойнасць, ініцыятыўнасць і адказнасць.

**Практыка выкарыстання тэставых заданняў на ўроках беларускай мовы ў 5-6 класах**

Пачынаць работу з тэставымі заданнямі на ўроках мовы мэтазгодна з пятага класа, калі беларуская мова вывучаецца як “уладкаваная сістэма, дзе ўзаемадзейнічаюць гукі, марфемы, словы, іх формы, словазлучэнні і сказы”.

Тэставую праверку на ўроках беларускай мовы арганізоўваю па-рознаму, у залежнасці ад мэты і ад зместу правяраемага матэрыялу. Сярод мэтавых установак праверкі выдзяляю наступныя: праверыць выкананне дамашняга задання, выявіць падрыхтаванасць вучняў да вывучэння новага матэрыялу, праверыць ступень разумення і засваення новых ведаў. У залежнасці ад зместу праводжу тэсты па матэрыяле папярэдняга ўрока або па асобных раздзелах і тэмах.

За час працы я пераканалася ў эфектыўнасці выкарыстання тэставага кантролю таксама і для ліквідацыі прабелаў ведаў вучняў.

Пачынаючы ўжо з пятага класа, праводжу ўступныя, выніковыя, бягучыя, прамежкавыя, трэніровачныя тэставыя работы. Выкарыстоўваю тэставыя заданні амаль на любым этапе ўрока беларускай мовы, пры вывучэнні любой тэмы.

Практыка работы ў 5 класах сведчыць, што для вучняў гэтага ўзросту найбольш эфектыўнымі з’яўляюцца тэставыя заданні <u>закрытага тыпу</u>. У аснову іх імкнуся пакласці заданні паводле разнастайных прынцыпаў.

**Тэсты з заданнямі закрытага тыпу:**

<u>Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць схеме «прыметнік + назоўнік»:</u>

1) бабуліны казкі; 2) бабуля вяжа; 3) рабочы з завода; 4) бязвоблачнае неба; 5) рашаем задачу.

<u>Адзначце прыметы, уласцівыя аднародным членам сказа:</u>

1) адказваюць на адно і тое ж пытанне; 2) удакладняюць сэнс папярэдніх слоў; 3) адносяцца да аднаго і таго ж слова; 4) з’яўляюцца адным членам сказа; 5) можна паставіць пытанне ад аднаго слова да другога.

Часта прапаную вучням абвесці адказы “так” ці “не”.

**Тэма** “Правілы пераносу слоў” (5 клас)

Адзначце правільны адказ.

| **Сцверджанне** | | |
|---|---|---|
| Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па складах | Так | Не |
| Нельга пакідаць або пераносіць на наступны радок адну літару | Так | Не |
| Ад папярэдняй літары аддзяляюцца літары *ў, й, ь* і апостраф | Так | Не |
| Словы пісь-мо, траў-ка правільна падзелены для пераносу | Так | Не |
| Склад з адной галоснай літарай можна перанесці на наступны радок | Так | Не |

Як у пятым, так і ў шостым класах прапаную вучням тэставыя заданні <u>адкрытага тыпу</u>. Падобны тып тэставых заданняў патрабуе лагічнага мыслення, практычных навыкаў. Вучні

паспяхова спраўляюцца з такімі заданнямі. Спачатку працуем калектыўна, а праз пэўны перыяд уключаю іх у тэст для прамежкавага тэставага кантролю.

**Тэсты з заданнямі адкрытага тыпу**

**5 клас**

Запішыце словы па-беларуску:

1) гладиолус; 2) скорпион; 3) биолог; 4) пианино; 5) чемпионат; 6) авиация.

Працягніце сказ: Азначэнне – дадены член сказа, які…

**6 клас**

Вызначце від лічэбнікаў паводле складу:

а) тры; б) пяцьдзясят; в) шэсць сёмых; г) васямнаццаць; д) дзевяноста.

Утварыце ад назоўнікаў, што ў дужках, прыметнікі, каб атрымаліся словазлучэнні:

а) (ластаўка) гняздо; б) (бабуля) хваляванні; в) (Міхась) прыгоды; г) (мама) характар; д) (цётка) парада.

Часцей за ўсё тэставы кантроль выкарыстоўваю на этапе кантролю атрыманых ведаў па тэме. Ён дазваляе выявіць рэальны ўзровень падрыхтоўкі вучняў па адной або некалькіх тэмах раздзела. Так, пасля вывучэння тэм “Зычныя гукі”, “Мяккі знак і апостраф”, “Зычныя [д]-[дз], [т]-[ц]”, “Правапіс у, ў”, “Падоўжаныя зычныя”, “Прыстаўныя зычныя і галосныя” ў 5 класе выкарыстоўваю тэст, на выкананне якога адводжу 10-12 хвілін.

**Тэсты на этапе кантролю атрыманых ведаў**

1. Вызначце, у якім радзе ўсе зычныя глухія:

а) [в], [г], [м], [к]; б) [г], [з], [ж], [ў]; в) [п], [т], [ш], [ц].

2. Пазначце пары, у якіх словы маюць аднолькавы гукавы склад:

а) снег – смех; б) грыб – грып; в) рэдка – рэдзька; г) везці – весці.

3. Адзначце словы ў якіх трэба ўставіць літару “ь”.

а) матыл(?)кі; б) пес(?)ня; в) прос(?)ба; г) мыш(?).

4. Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф:

а) вераб…і; б) здароў…е; в) сям…я; г) л…е.

5. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць літару “ц”:

а) газе__а; б) у газе__е; в) ро__ік; г) бу_эрброд.

6. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць “дз”:

а) каман…ір; б) по…віг; в) …ырэктар; г) сту…энт.

7. Адзначце рад, у якім правільна напісаны ўсе словы:

а) ноўтбук, страўс, шукаў; б) паўза, фаўна, па-ўчарашняму;

в) трыўмф, каупак, вакуум.

8. Адзначце словы з падоўжанымі зычнымі:

а) насе(н, нн)е; б) ва(н, нн)а; в) ка(с, сс)а; г) гру(п, пп)а.

9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара:

а) па..уцінне; б) ..учора; в) ..облака; г) ..узор.

10. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску няма прыстаўной літары:

а) старая ..львіца; б) на ..мшысты дол; в) луста ..ржанога хлеба; г) пад ..льдзінай.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| в | б,г | а,в | а,в | б,в | а,б | б | а,б | а,в | а,в |

Найлепшым спосабам для замацавання ведаў, напрыклад, па тэме “Правапіс -н-, -нн- у прыметніках” у 6 класе лічу калектыўнае выкананне тэматычнага тэсту з абавязковым каменціраваннем. На наступным ўроку аналагічны тэст магу прапанаваць ў якасці індывідуальнага задання на этапе праверкі дамашняга задання.

**Тэма.** Правапіс -н-, -нн- у прыметніках (6 клас)

Выберыце слупок, у якім паслядоўна размешчаныя літары адпавядаюць прапушчаным у дадзеных словах:

| | А) | Б) | **В)** | Г) |
|---|---|---|---|---|
| Драўля…ы | н | н | н | нн |
| Вясе…і | нн | н | нн | нн |
| Вогне…ы | н | нн | нн | нн |
| Песе…ы | н | нн | н | н |

Тэматычныя тэсты па пунктуацыі лічу мэтазгодным прымяняць на этапе самакантролю ведаў. Яны большыя па аб'ёме, на іх патрэбна больш часу. Такое прымяненне тэстаў з'яўляецца не толькі формай кантролю за ўзроўнем ведаў вучняў, але і падрыхтоўкай да цэнтралізаванага тэсціравання. Так, напрыклад, пасля вывучэння раздзела “Сінтаксіс і пунктуацыя” ў 5 класе выкарыстоўваю тэст на дзесяць заданняў. На выкананне яго адводжу 15 хвілін.

**Выніковыя тэсты. Раздзел “Сінтаксіс і пунктуацыя” (5 клас)**

1. Якое азначэнне правільна раскрывае змест раздзела “Сінтаксіс”?
а) Сінтаксіс вывучае словазлучэнне, сказ;
б) Сінтаксіс вывучае правілы пастаноўкі знакаў прыпынку.

2.Адзначце словазлучэнні:
а) сястра і брат; б) дапамога сябру; в) у школе; г) доктар дапамог.

3. Адзначце клічны сказ:
а) Сябар прыйшоў на дапамогу; б) Калі прыйдуць госці;
в) Якая прыгажосць вакол; г) Хутка дождж сціх.

4. Адзначце пабуджальны сказ:
а) Пад нагамі шамаціць рознакаляровае лісце; б) А вунь чырвоны клён;
в) Чуецца курлыканне жураўоў; г) Пажадайце ім шчаслівай дарогі.

5. Адзначце неразвіты сказ:
а) Пайшоў снег; б) У небе спяваюць жаваранкі;
в) Прыйшла вясёлая і шумлівая вясна; г) На дарогах гамоняць ручайкі.

6. Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова: Мінск – сталіца Беларусі.
а) дзейнік; б) выказнік; в) дапаўненне; г) азначэнне; д) акалічнасць

7. Адзначце сказ, які адпавядае схеме:
акалічнасць + выказнік + азначэнне + азначэнне + дзейнік.
а) Пад вечар неба зацягнулі цяжкія хмары.
б) У полі разгуляўся злы снежаньскі вецер.
в) Ён зламаў на полі дуплаваты дуб.
г) На вуліцы пачаў сыпаць халодны дождж.

8. Адзначце сказ са звароткам:
а) Цёплы дождж́ык не прагнаў дзяцей з вуліцы.
б) Ці любіш ты дружа цёплы дождж́ык?
в) У меру свяціла сонца і ў час ішоў цёплы дождж́ык.
г) Я думаў пра цёплы дождж́ык, якога так не хапала.

9. Адзначце сказ, у якім перад злучнікам трэба паставіць коску:
а) Дзень быў пахмурны і даволі цёплы.
б) Трэба спяшацца на вакзал бо цягнік адыходзіць праз гадзіну.
в) Адцвіла вясна і на ўзлеску.
г) Шуміць вецер над лесам ды галосіць над апусцелым полем.

10. Адзначце сказ з простай мовай: а) Маладая вясна радасна ўсміхнулася і павіталася Вось і я!; б) На вуліцы смяяліся дзеці; в) Вясна сонечнымі промнямі расцалавала арэхавы куст; г) Падаў голас салавейка.

Адказы:

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а | б | в | г | а | б | б | б | б | а |

У сваёй практыцы прымяняю таксама паўрочныя тэматычныя тэсты на паўтарэнне ўжо пройдзенага матэрыялу. На гэтым этапе можа быць прапанаваны кароткачасовы тэст на 5-7 пытанняў. Разлічаны ён прыблізна на 5-10 хвілін. Такія тэсты вельмі эфектыўны ў пачатку ўрока-абагульнення ведаў ці перад кантрольнай работай. Патрэбна адзначыць, што большасці вучняў падабаецца такая форма работы, і многія з задавальненнем выконваюць тэсты, на якіх яны поўнасцю адпрацоўваюць дадзеную арфаграму ці пунктаграму.

З вялікім задавальненнем вучні выконваюць тэставыя заданні на ўстанаўленне адпаведнасці. Яно ўяўляе сабой набор элементаў у двух слупках. Гэта дае магчымасць праверыць узаемасувязь паняццяў і фактаў, суадносіны паміж пэўнымі аб'ектамі і іх уласцівасцямі.

**Тэставыя заданні на ўстанаўленне адпаведнасці**

Пры звароце да раздзела "Лексіка" практыкую заданні наступнага зместу.

Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і іх назвай. Адказ запішыце.

| | |
|---|---|
| А. Арфаграфія-правапіс | 1. Амонімы |
| Б. Світае-цямнее | 2. Устарэлыя словы |
| В. Матчына ласка-гарэзлівая ласка | 3. Сінонімы |
| Г. Велічны помнік-велічны гімн | 4. Антонімы |
| Д. Перст. чало, лёкай, вярста | 5. Мнагазначныя словы |

Не менш цікавымі для дзяцей сталі заданні тыпу ўстанаўлення правільнай паслядоўнасці. Асабліва эфектыўнымі з'яўляюцца яны на ўроках па тэмах раздзела "Тэкст".

**Заданні на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.**

**Тэма** "Тэкст. Прыметы тэксту" (5 клас)

Адзначце, у якім парадку трэба размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст.

1) Ці апраўдалі надзеі, спадзяванні іхнія. 2) У тых позірках ёсць і нейкая магічная сіла. 3) Яшчэ і цяпер у многіх сялянскіх хатах жыве даўняя завядзёнка: фотакарткі бацькоў і дзядоў трымаюць пад шклом у рамках на сцяне. 4) Іншы падшыванец, можа, і хацеў бы зрабіць калі якую псоту, але з фотакартак глядзяць на яго строгія і адначасова добрыя вочы дзядулі, бабулі… 5) Продкі нашы нібы не пайшлі з жыцця, не памерлі, а знаходзяцца сярод нас, быццам сочаць за намі.

а) 2, 1, 4,5,3; б) 4,3,5,2,1; в) 5,2,3,4,1; г) 3,5,1,2,4; д) 3,4,1,2,5

У час праверкі дамашняга задання ў 5–6 класах замест вуснага франтальнага апытвання раздаю вучням карткі з бі-тэстамі для праверкі засвоенасці імі тэмы папярэдняга ўрока і наступнай ліквідацыі прабелаў у ведах. Заданні **бі-тэстаў** патрабуюць адказаў "так +" або "не-". Такія заданні дастаткова лёгкія для вучняў, таму на практыцы іх выкарыстоўваю не часта. На выкананне іх адводжу не больш 2 хвілін.

**Тэсты на этапе праверкі выканання дамашняга задання**

**Бі-тэст па тэме "Неразвітыя і развітыя сказы"(5 клас)**

Якія з прыведзеных ніжэй фармулёвак адпавядаюць паняццю "развіты сказ"? Калі адказ правільны, ставім "+", калі няправільны – "–".

1. Гэта сказ, у склад якога ўваходзяць толькі дзейнік і выказнік.
2. Гэта сказ, у склад якога ўваходзіць толькі дзейнік.
3. Гэта сказ, у склад якога ўваходзіць толькі выказнік.
4. Гэта сказ, у якім, акрамя дзейніка і выказніка, ёсць даданыя члены сказа.

Адказ. 1 -; 2 -; 3 -; 4 +

На этапе актуалізацыі ведаў тэставы кантроль садзейнічае ўзнаўленню ў памяці вучняў значных паняццяў па раней вывучаных тэмах. Ён дамапагае хутка вызначыць памылкі і прабелы ў ведах і ўменнях, а таксама выбраць правільныя шляхі для ліквідацыі гэтых прабелаў. Выкарыстанне тэстаў на дадзеным этапе спрыяе фарміраванню сістэмнасці ведаў,

садзейнічае ўстанаўленню сувязі новага матэрыялу з раней вывучаным, прадухіляе вучняў ад магчымай страты агульнай арыенціроўкі ў вывучаемым матэрыяле. Па гэтай прычыне лічу апраўданым прымяненне тэставага кантролю ў 5–6 класах пры вывучэнні тэм, якія раней вывучаліся ў пачатковых класах.

**Тэсты на этапе актуалізацыі ведаў.**

**Бі-тэст па тэме** “Словазлучэнне” (5 клас)

Якія з прыведзеных ніжэй спалучэнняў слоў з’яўляюцца славазлучэннямі? Калі адказ правільны, ставім “+”, калі няправільны – “–”.

1.Прыгожыя кветкі.
2.Вучні і настаўнікі.
3.Помніць пра бацькоў.
4.Бабуля піша.
5.Каля хаты.
6.Я чытаю кнігу.
7.Разумны чалавек.
8.Наша школа.

Адказы. 1 +, 2 –, 3 +, 4 –, 5 –, 6 –, 7 +, 8 +.

Каб выклікаць у вучняў цікавасць да вывучэння новага матэрыялу і паставіць іх у тупіковую сітуацыю, прапаную два-тры тэставыя заданні з пэўнымі выключэннямі па гэтай тэме, з якімі клас яшчэ не знаёміўся. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Правапіс галосных е, ё, я” прапаную заданні:

1.Вызначце слова, у якім усе галосныя напісаны правільна:
а) абяліск; в) сяржант; д) плеяда; б) каляктыў; г) лягенда;
2.Вызначце, якія словы, перакладзеныя з рускай мовы, запісана няправільна:
а) медаль – мядаль; г) сержант – сяржант; б) лебеда – лябеда; д) снегопад – снегапад;
в) коллектив – калектыў.

А перад вывучэннем тэмы “Вымаўленне звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных гукаў” практыкую наступныя заданні:

1.Вызначце, гучанне якіх слоў не супадае з напісаннем:
а) ручнік; в) перапісчык; д) садок; б) скінуць; г) просьба;
2.Вызначце, гучанне якіх слоў супадае з напісаннем:
а) дарожка; в) пройдзеш; д) бярозанька; б) дарожны г) неабходна.

На гэтым этапе ўрока з мэтай зацікаўлення вучняў прапаноўваю тэставыя заданні **“з сакрэтам”**. Напрыклад, патрэбна выканаць тэставае заданне па пройдзенай тэме. Адказаўшы правільна на пытанні, вучні змогуць назваць тэму ўрока.

**Тэма** “?” (5 клас)

1. Адзначце словы, у якіх літара **я** абазначае 2 гукі:
**П**) клякса; **А**) яма; **Ф**) п’яўка.
2. Адзначце словы, у якіх літара **е** абазначае адзін гук:
**Л**) цень; **О**) ехаць; **Т**) лета.
3. Адзначце слова, у якім літара **ю** абазначае два гукі:
**А**) юны; **Ж**) пюрэ; **Э**) любоў.
4. Адзначце, калі літары **е, ё, ю, я, і** абазначаюць два гукі:
**Ч**) пасля зычнага; **В**) пасля галоснага; **І**) у пачатку слова.

Ключ: 1) ; 2) ; 3) ; 4) (АЛФАВІТ )

На этапе фарміравання ўменняў і навыкаў прымяняю дыягнастычныя тэсты, накіраваныя на засваенне тэорыі і прымяненне яе на практыцы. Для таго каб пісаць граматна, вучні

павінны спачатку засвоіць тэарэтычны матэрыял, а пасля навучыцца прымяняць арфаграфічныя і пунктуацыйныя правілы. Веданне гэтых правілаў з'яўляецца абавязковай задачай кожнага вучня. Па гэтай прычыне ствараю тэарэтычныя тэставыя заданні. Такія тэставыя заданні прымушаюць школьнікаў уважліва слухаць настаўніка ці самастойна чытаць параграф па вывучаемай тэме. Дыягнастычныя тэсты дазваляюць вызначыць, якія цяжкасці ўзніклі пры засваенні новага матэрыялу. На гэты этапе шырока выкарыстоўваю **клоўз-тэсты**.

У лінгвістыцы і методыцы выкладання беларускай мовы клоўз-тэстам прынята называць тэкст з прапушчанымі кампанентамі (галоўным чынам, асобнымі словамі, але не толькі). Задача таго, хто выконвае клоўз-тэст – уставіць гэтыя кампаненты.

У якой вучэбнай сітуацыі можа выкарыстоўвацца клоўз-тэст на ўроку беларускай мовы:

- пры навучанні пераказу (напрыклад, пры падрыхтоўцы да яго напісання);
- як падрыхтоўчая праца з тэкстам перад сачыненнем-разважаннем, пры навучанні яго напісання;
- пры навучанні разумення тэкстаў розных тыпаў;
- пры падрыхтоўцы да ЦЭ: часткі С;
- пры вывучэнні тэм "Лексіка", "Тэкст", "Сродкі сувязі ў тэксце", "Тыпы тэксту", многіх тэм па развіцці прамовы, пры вывучэнні тэм па стылістыцы і інш ;
- як папярэдняя праца з моўным аналізам тэксту.
- пры вывучэнні новага матэрыялу, пры правядзенні абагульняючых урокаў, на першых уводных уроках у пачатку года, пры паўтарэнні і інш.

Пры працы з клоўз-тэстам вельмі важна вытрымліваць прынцып ад простага да складанага. Пачынаць можна з тэстаў, у аснове якіх адно–два выказванні, гэта значыць вельмі кароткі тэкст. Затым пастунова павялічваць аб'ём.

Дзеці, навучаныя працы з клоўз-тэстам, паспяхова ўжываюць наяўныя навыкі ў іншых сітуацыях тэкставай дзейнасці, напрыклад, пры напісанні перакладу: слухаючы тэкст, яны фіксуюць ключавыя словы, фрагменты тэксту, а затым менавіта па іх аднаўляюць тэкст. Таму, клоўз-тэст эфектыўны як спосаб падрыхтоўкі да перакладу, сачынення.

Адзначанае дазваляе зрабіць выснову, што клоўз-тэст на занятках па беларускай мове можа быць выкарыстаны не толькі як форма кантролю, але і як падрыхтоўчыя, навучальныя практыкаванні – аднаўленне ў тэксце апушчаных элементаў – слоў, словазлучэнняў, сказаў – пры працы з ключавымі словамі. Пры вывучэнні нейкай канкрэтнай моўнай адзінкі падбіраецца такі тэкст, у якім гэтая з'ява частотная. Напрыклад, пры вывучэнні прыметніка ў 6 класе можна прапанаваць такія заданні.

**Дыягнастычныя тэсты на этапе фарміравання ўменняў і навыкаў**

**Тэма.** Адназначныя і мнагазначныя словы (5 клас)

Дапоўніце клоўз-тэст звесткамі, якіх не хапае.

1) Словы, якія маюць __ лексічнае значэнне, называюцца адназначнымі.

2) Словы, якія маюць __ лексічных значэнняў, называюцца мнагазначнымі.

3) __ словы называюць розныя прадметы, дзеянні, аднак яны хоць чым-небудзь падобныя паміж сабой.

**Прыметнік як часціна мовы (6 клас)**

<u>Дапоўніце тэкст словамі.</u>

Нашы людзі, як і твае бацька і маці, як твае дзяды, прадзеды і прапрадзеды – ---, ---, ---. Мы – --- і --- народ – --- і ---, --- і ---, --- і ---. Кожны з нас мае радасць ганарыцца, што належыць менавіта да такога народа і такой зямлі. (*Паводле Я. Сіпакова)*

*Адказ.* Шчырыя, сумленныя, мудрыя, <u>злыя</u>, вялікі, старажытны, мудры, светлы, чысты, <u>дрэнныя</u>, даверлівы, зычлівы, дабрадушны.

**Скланенне якасных і адносных прыметнікаў (6 клас)**

Узнаві тэкст, падабраўшы адпаведныя прыметнікі са слоў для даведкі. Дапасуй прыметнікі да назоўнікаў у тэксце.

Калі б мы маглі перанесціся ў Мінск … стагоддзя, то ўбачылі б на беразе Свіслачы …. пляцоўку, адгароджаную … тынам ад … лесу. У цэнтры пляцоўкі пануе … дуб у чатыры абхваты. Дрэва лічаць … і называюць Волатам. На яго … голлі развешаны … стужкі і вышытыя ручнікі. Справа ад дуба з … камянёў слупком выкладзена вогнішча-зніч. Гэта Агонь або Жыжа. Але самая … ўвага тут каменю. Яго імя Дзед ці Стары. Дубу, агню і каменю нясуць людзі ахвяраванні, просяць адвесці бяду, пазбавіць ад хваробы. (*Паводле Э. Ляўкова)*

**Словы для даведкі:** *невялікі, мінулы, глухі, высокі, ніжні, стары, свяшчэнны, вялікі, стракаты, невялікі.*

***Адказ.*** Калі б мы маглі перанесціся ў Мінск **мінулага** стагоддзя, то ўбачылі б на беразе Свіслачы **невялікую** пляцоўку, адгароджаную **высокім** тынам ад **глухога** лесу. У цэнтры пляцоўкі пануе **стары** дуб у чатыры абхваты. Дрэва лічаць **свяшчэнным** і называюць Волатам. На яго **ніжнім** голлі развешаны **стракатыя** стужкі і вышытыя ручнікі. Справа ад дуба з **невялікіх** камянёў слупком выкладзена вогнішча-зніч. Гэта Агонь або Жыжа. Але самая **вялікая** ўвага тут каменю. Яго імя Дзед ці Стары. Дубу, агню і каменю нясуць людзі ахвяраванні, просяць адвесці бяду, пазбавіць ад хваробы.

Спачатку прапануецца пытанне на першаснае ўспрыманне агульнага сэнсу тэксту, які мае пропускі. Такое пытанне, з аднаго боку, прымушае школьнікаў ўбачыць галоўнае ў тэксце, улавіць агульнае, нягледзячы на пропускі. З іншага боку, для настаўніка гэта важна ў дыягнастычных адносінах: калі дзеці на яго адказваюць, то можна прыступаць да запаўнення пропускаў. Гэты этап павінен быць досыць простым і ў той жа час сінтэзуючым прачытанае, уключаючы вызначэнне асноўнай думкі, тэмы тэксту, выкананне задання на падбор загалоўка. Затым у карце тэксту даецца ключ (адказ) – прапушчаныя аўтарскія словы. Яны даюцца ў парадку зробленых пропускаў і ў той форме, у якой яны ўжытыя ў тэксце. Пры гэтым ключавыя словы вылучаюцца паўтлустым шрыфтам.

Дыягнастычныя тэсты пачынаю прымяняць ў 5-6 класах. Невялікія тэсты па тэмах раздзела “Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія” для пяцікласнікаў садзейнічаюць набыццю навыкаў работы з тэставымі заданнямі, дапамагаюць справіцца з трывожнасцю пры выкананні гэтага віду работы ў старэйшых класах. У працэсе работы над дыягнастычным тэстам добра відаць, які пункт правіла не засвоены вучнем.

Выкарыстоўваю таксама **тэст-ранжыраванне**. Ён ўяўляе сабой пералік аб’ектаў кантролю, якія павінны быць размешчаны па вызначаным парадку (напрыклад, у парадку ўзрастання якога-небудзь істотнай прыкметы).

**Тэст-ранжыраванне. Тэма “Склад слова”**

Пакажыце правільную паслядоўнасць разбору слова па складах:

1) аснова; 2) прыстаўка; 3) канчатак; 4) суфікс; 5) корань.

Інфарматар: 3, 1, 5, 2, 4.

Пры выкананні **чэнч-тэсту** вучням прапануецца знайсці слова, якім падменена аўтарскае, і аднавіць арыгінальны тэкст. Чэнч-тэст дапамагае навучэнцам аднавіць веды і праверыць саміх сябе. Прыклад чэнч-тэсту:

**Тэма “Антонімы” (5 клас)**

Прачытайце прыказкі. Запішыце іх у пачатковым выглядзе. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць супрацьлеглыя паняцці.

1. **Кіслая** часам праца, ды хлеб ад яе салодкі. (Горкая)
2. Хто не бачыў **далёкага**, той з малога дзівіцца. (Вялікага)
3. **Вышэй** паложыш – бліжэй возьмеш. (Далей)
4. **Добра** пасварыцца, цяжка памірыцца. (Лёгка)
5. Аднаму густа, а другому **капуста**. (Пуста)

На сваіх уроках выкарыстоўваю цікавы прыём тэставых заданняў **"Я – мы – адваротная сувязь"**. За адносна кароткі прамежак часу ёсць мажлівасць вызначыць узровень засваення атрыманай інфармацыі кожным вучнем і актывізаваць працу па пройдзеным матэрыяле. Перад выкананнем задання кожнаму вучню прапаноўваю табліцу.

| **Я** | **Мы** | **Правільныя адказы** |
|---|---|---|
| | | |

На першым этапе рыхтую пытанні на разнастайных носьбітах. Кожны вучань класа індывідуальна ўносіць пад адпаведным нумарам свае лічбы ці словы-адказы ў першую калонку табліцы "Я". Затым дзеці аб'ядноўваюцца ў групы. Удзельнікі тэсціравання параўноўваюць свае адказы. Прыйшоўшы да канчатковай згоды, група тэстуемых на любым адным бланку калектыўна выстаўляе канчатковыя адказы ў другой калонцы табліцы "Мы". На наступным этапе ўсяму класу даю эталон адказаў ("Адваротная сувязь"). З'явілася магчымасць зверыць свае "Я", "Мы" з дадзеным эталонам і прыйсці да канчатковага варыянту. Пасля гэтага ацэньваем самастойную працу шляхам падліку балаў за кожнае выкананае заданне. Стаўлю адзнаку групе і праводжу работу над дапушчанымі памылкамі. Звычайна такі прыём выканання тэставых заданняў дае добрыя вынікі, павышае цікавасць вучняў да вывучаемага матэрыялу.

<u>Прапаную тэст для настаўнікаў</u>

1. Што аб'ядноўвае настаўнікаў?

а) вучні;

б) сшыткі;

**в)** лазня ці кафэ.

2. Аб чым марацць настаўнікі ў школе?

а) праверыць сшыткі;

б) правесці адкрыты ўрок;

**в)** выпіць каву з калегай у цішыні.

3. Якую пісьмовую работу больш усяго любяць правяраць настаўнікі?

а) сачыненне;

б) пераказ;

**в)** тэставую работу.

Спачатку адказвае кожны самастойна. Пасля адказы абмяркоўваюць разам. Даю правільныя адказы.

Актыўна выкарыстоўваю **"Каляровы тэст"**. Работа з каляровымі алоўкамі здымае пэўную напружанасць пры выкананні заданняў, спрыяе эстэтычнаму выхаванню асобы, з'яўляецца магчымасць па "гарачых слядах" правесці карэкцыю ведаў, праверка работ не займае шмат часу, падыходзіць для навучэнцаў рознага ўзросту, добра спрацоўвае на любым этапе ўроку.

Сутнасць яго ў тым, што вучні ў выніку выканання тэставых заданняў атрымоўваюць назвы колераў для расфарбоўкі прапанаванага малюнка. Малюнак (стылізаваная выява кветкі, ракеты, каня, вусеня і г. д.) падбіраецца настаўнікам і раздаецца кожнаму вучню. На элементах малюнка ўказваюцца лічбы, якія адпавядаюць нумару канкрэтнага задання тэста. Напрыклад, 1 – гэта тулава каня, 2 – мыза, 3 – грыва і хвост, 4 – капыты, 5 – сядло.

На асобных картках надрукаваны сам тэст, усе заданні якога звязаны з прапанаваным на той жа картцы тэкстам (так улічваецца рэкамендаваны праграмай тэкстацэнтрычны прынцып адбору зместу навучання, калі моўныя з'явы разглядаюцца ў кантэксце).

**Каляровы тэст па тэме “Змяненне назоўнікаў у адзіночным і множным ліку”**

З вуснаў маці яно ўвайшло ў наша жыццё. У ціхім журчанні матчыных песень, у пяшчотных яе ласках мы ўлавілі яго прыгажосць. Як чароўны ключ, яно адкрывае нам разнастайныя цуды і таямніцы жыцця. Незвычайнае хараство і зладжанасць чуюцца нам у гучанні роднага слова (Анатоль Крывіцкі).

1. У першым сказе
* няма назоўнікаў (сіні);
* 2 назоўнікі (белы);
* 3 назоўнікі (жоўты).
2. (У) журчанні – гэта назоўнік
* ж.р. (зялёны);
* н.р. (карычневы);
* м.р. (аранжавы).
3. У сказе …яно адкрывае нам таямніцы…
* таямніцы – В.с. (аранжавы);
* таямніцы – Н.с. (чырвоны);
* таямніцы – Р.с. (сіні).
4. Зладжанасць – гэта назоўнік
* 1 скланення (карычневы);
* 2 скланення (сіні);
* 3 скланення (зялёны).
5. Разбор назоўніка (у) гучанні:
* н.р., мн.л., 2 скл., М.с. (чорны);
* н.р., адз.л., 2 скл., Т.с. (белы);
* н.р., адз.л., 2 скл., М.с. (сіні).




Выкарыстанне тэставых заданняў забяспечвае аператыўнасць праверкі работ вучняў, зводзіць да мінімуму суб’ектывізм настаўніка і дае яму магчымасць аб’ектыўна ацаніць якасць засваення вучнямі праграмнага матэрыялу, выяўляе прабелы ў ведах вучняў з мэтай іх наступнай ліквідацыі, актуалізуе самастойную працу вучняў, арыентаваных на індывідуальны поспех, робіць урок сучасным.

**III. Рэфлексійны этап**

Зварот да “Картак чаканняў”, на якіх настаўнікі пісалі свае пажаданні і спадзяванні. Калі спадзяванні збыліся, то абводзяць у авал. Карткі збірае настаўнік.

**Літаратура**

1. Аванесов, В. С. Композиция тестовых заданий / В. С. Аванесов. – М.: Центр тестирования, 2002. – 240 с.

2. Богачева, И. В. Обобщение и представление опыта педагогической деятельности: метод. рек. / И. В. Богачева, И. В. Фёдоров, О. В. Сурикова; ГУО “Акад. последиплом. образования”. – Минск: АПО, 2012. – 92 с.

3. Валочка, Г. М. Беларуская мова: тэставыя работы: 8 – 11 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко. – 2-е выд. – Мінск: Аверсэв, 2013. – 158 с.

4. Запрудский, Н. И. Педагогический опыт: обобщение и формы представления / Н. И.Запрудский. – Мінск: Сэр-Вит, 2014.
5. Марозава, Я. Н. Рыхтуемся да цэнтралізаванага тэсціравання (“Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”): дапаможнік для слухачоў факультэта давузаўскай падрыхтоўкі. – 2-е выд., дапрац. – Віцебск: Выд-ва УА “ВДУ імя П.М.Машэрава”, 2011. – 172 с.
6. Праскаловіч, В. У. Тэставыя тэхналогіі па беларускай мове: праблемы і перспектывы / В. У. Праскаловіч // Беларус. мова і літ. – 2009. – № 5. – С. 33–36.